

Некаторыя лічаць правільным выкінуць смецце па дарозе на электрычку.

**ФОТАФАКТ**

# На электрычку са зламаным стулам! Навошта?

**Гэты здымак зроблены ля чыгуначнага прыпынку «Ласі».**

Пляцоўка для збору цвёрдых бытавых адходаў тут завалена розным смеццем. Прычым старыя вокны, непатрэбную мэблю, пашкоджаныя пластыкавыя ёмістасці і іншае наўрад ці пакінулі пасажыры. Хутчэй за ўсё гэтыя рэчы прынеслі і выкінулі дачнікі або мясцовыя жыхары.

Наша газета не раз звярталася да тэмы абыходжання з цвёрдымі бытавымі адходамі. У раёне створаны ўсе умовы, каб людзі і суб'екты гаспадарання своечасова пазбаўляліся ад смецця. На Маладзечаншчыне наладжаны раздзельны збор адходаў, вядзецца нарыхтоўка другаснай сыравіны. Жадаючыя могуць заключыць дагавор з адпаведнымі арганізацыямі на вываз старой бытавой тэхнікі і буйнагабарытных рэчаў.

Але ў шэрагу выпадкаў правільна абысціся са смеццем перашкаджае недахоп культуры. Вось і аказваюцца непатрэбныя рэчы там, дзе яны быць не павінны – ля прыпынкаў грамадскага транспарту або ў прыродных экасістэмах.

Для некаторых «аптымізатараў» гэта эканомія часу (маўляў, навошта несці адходы на спецыяльную пляцоўку ў садовым таварыстве або ў вёсцы, калі можна выкінуць іх па дарозе на электрычку). Некаторыя мэтанакіравана некарэктна пазбаўляюцца ад смецця. Іх не турбуе, што потым усім прахожым даводзіцца бачыць непрывабную карціну, а работнікам транспартных і камунальных арганізацый выконваць дадатковую работу. Згадзіцеся, так быць не павінна.

**Тэкст і фота: Алег БЯГАНСКІ.**